**Мінянкоў Р.Я.**, *дацэнт*,
**Горных А.А.**, *дацэнт*

# КУЛЬТУРАЛОГІЯ Ў ВНУ: ДА ПРАБЛЕМЫ АДУКАЦЫЙНАГА СТАНДАРТУ

Курс культуралогіі ў сістэме айчыннай гуманітарнай адукацыі стаў уключацца ў навучальны працэс з пачатку 1990-х гадоў. З аднаго боку, ён быў павінен вывесці даследаванні культуры з-пад ідэалагічнай і метадалагічнай апекі сацыяльнай філасофіі «гістарычнага матэрыялізму», а з другога, падвесці вызначаны тэарэтычны фундамент пад эмпірычныя гісторыка-культурныя курсы. У выніку склалася першаснае разуменне спецыфікі новага прадмета як аб'яднання дэідэалагізаванай тэорыі культуры з гісторыяй культуры. Пры гэтым практычна ўсе гуманітарыі згодны з тым, што культуралогія займае своеасаблівую пазіцыю ў спектры сучасных гуманітарных навук і што ёй належыць цэнтральнае месца ў сістэме гуманітарнай падрыхтоўкі студэнтаў. Але далей гэтага згода не ідзе.

Справа ў тым, што ўсведамленне высокай значнасці культуралагічнага напрамку ў сістэме адукацыі суправаджаецца невыразнасцю прадметна-дысцыплінарнага статусу культуралогіі, яе змястоўнага накірунку, структуры і спосабаў яе пабудовы ў якасці прадмета выкладання. Па сутнасці азначэнне «культуралагічны» стала агульнаўжывальным для характарыстыкі нейкага асабліва цэласнага, усебаковага сучаснага разгляду таго ці іншага сацыяльнага феномена альбо якасці (стыльнасці) ўсяго арэала сучасных гуманітарных ведаў. Іншымі словамі, «культуралогія» застаецца прагматычна-сітуатыўна вызначаемым паняццем, змястоўнае напаўненне якога ў недапушчальнай ступені залежыць ад адукацыі, інтарэсаў канкрэтнага навукоўца ці выкладчыка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Як паказвае вопыт, у выкладанні культуралогіі (тэорыі і гісторыі культуры) склалася некалькі арыентацый:

а) трактоўка культуры як «дэкаратыўнага элемента» жыцця, крыніцы матывацыі паводзін індывіда і сацыяльных груп;

б) разуменне культуры пераважна як чагосьці ўжо «гатовага», «завершанага» і, адпаведна, аперыраванне «адабранымі часам» каштоўнасцямі;

в) розныя варыянты сінтэзу названых падыходаў, што прадугледжвае адбор «падзей культуры» з улікам інтарэсаў і накіраванасці слухачоў. Адразу адзначым, што нейкай адной кімсьці «прадпісанай» мадэлі пабудовы курса культуралогіі і яе выкладання ўвогуле быць не можа. Але ў любым выпадку перад выкладчыкам з непазбежнасцю паўстаюць наступныя прынцыповыя праблемы: вызначэнне метадалагічных асноў і дыдактычных мадэляў пабудовы вучэбнага курса, яго агульнай канцэптуальнай схемы; сістэматызацыя паняційна-катэгарыяльнага апарату культуралогіі; выяўленне асноўных дыдактычных адзінак курса і вызначэнне яго найбольш аптымальнай структуры; выдзяленне тэкстаў, якія мэтазгодна ўключаць у вучэбныя праграмы; выяўленне магчымасці выкладання культуралогіі як інтэграванага курса, але з улікам варыятыўнасці ў залежнасці ад профілю ВНУ і спецыяльнасці. Ігнараванне, канцэптуальная нявырашанасць хоць адной з гэтых праблем вельмі ўскладняць пабудову цэласнага вучэбнага курса і — што прынцыпова важна — яго метадычнае забеспячэнне.

Такім чынам, відавочна неабходнасць пабудовы інтэгратыўнага культуралагічнага курса, змест якога карэліраваў бы з універсаліямі культуры і садзейнічаў бы выяўленню глыбінных агульнакультурных асноў як прафесійнай дзейнасці будучага спецыяліста, так і яго фарміраванню як асобы. Гэта значыць, што пры пабудове адукацыйнага стандарту трэба зыходзіць з разумення культуралогіі як міждысцыплінарнай навуковай і вучэбнай супольнасці.

У шырокім сэнсе культуралогію можна ўявіць як тэорыю і гісторыю культуры. На ўзроўні тэарэтычным культуралогія выступае як самасвядомасць культуры, якая выяўляе яе універсаліі. На ўзроўні тыпалагічнай сінхраніі і дыяхраніі культуралогія звяртаецца да канкрэтных формаў узаемаадносін людзей як аб'ектываваных вынікаў адносін чалавека да свету. Тым самым культуралагічны аналіз аказваецца ў сваёй прынцыповай цэласнасці і ўнутранай змястоўнай размеркаванасці сістэмай працэдур, пры дапамозе якіх выяўляюцца культурныя асновы і формы сапраўды гуманістычнай жыццядзейнасці чалавека.

Безумоўна, культуралагічныя веды шырэй класічных гуманітарных дысцыплін як паасобку, так і разам узятых; гэта, скажам так, асамблея навук аб культуры. У яе рамках ажыццяўляецца спроба, па-першае, звесці сацыялагічныя, філасофскія, эканамічныя і іншыя дысцыплінарныя формы ведаў у нейкую сукупнасць ведаў ад свеце (карціну свету, «светаадчуванне/светаўспрыманне/светапогляд» і да т.п.), па-другое, уключыць іх у гістарычную перспектыву чаргавання розных культурных мадэляў і тыпаў. Гэта значыць, што вылучаецца метадалагічная ўстаноўка на тое, каб:

— кожны феномен культуры (філасофскі трактат, літаратурны твор, народнае вераванне і г.д.) аналізаваць перш за ўсё ў сінхранічным вымярэнні ў якасці элемента, рэальны сэнс і функцыю якога можна зразумець толькі з яго структурнай пазіцыі ў сістэме культуры. Узорнымі ў гэтых адносінах з'яўляюцца працы прадстаўнікоў самых разнастайных гуманітарных плыняў XX ст. -- структуралізму (М.Фуко), культурнай антрапалогіі (Б.Маліноўскі), гісторыяграфіі (Ж.Ле Гоф) і інш. (найбольшае супраціўленне гэта ўстаноўка сустракае ў галіне класічнай філасофіі з яе прэтэнзіяй на «чыстае», па-за часам і прасторай, мысленне);

— у дыяхранічным плане адмовіцца ад дамінавання гегелеўскага прынцыпу культурнага кумулятывізму, які зводзіць культурную дынаміку да «прагрэсіўнага» ўвабрання новым культурным сэнсам ранейшага («зняцце з момантам утрымання») на карысць гістарычнага мыслення ў катэгорыях змены адносна аўтаномных культурных мадэляў, эпістэм, парадыгмаў і да т.п., без надзялення якога-небудзь з часавых вектараў (накіраваных у мінулае ці будучае) прывілеяваным каштоўнасным значэннем (разнастайныя дактрыны «залатога веку»).

У аксіялагічным аспекце культуралогіі, на наш погляд, не павінны прыпісвацца выключна стваральныя задачы фарміравання новай сістэмы каштоўнасцей, цэласнай асобы, нацыянальнай ідэі і да т.п. Мэты культуралогіі не вызначаюцца цалкам дастаткова знешнім для яе пафасам рэлігійна-дыдактычнага месіянства, гэтаксама як асветніцкім пафасам нейкай «апрацоўкі», удасканалення чалавека («фарміраванне асобы», «выхаванне чалавека» і г.д. у вызначаным актывісцкім, дзейным, стваральным духу /»культуратворчасць»/. Задачы культуралогіі не зводзяцца і да дэманстратыўна-адукацыйных мэт (каб студэнт проста ведаў, сістэмна ўяўляў гісторыю культуры і меў нейкую мінімальную эрудыцыю), а таксама да трэнінгу, экіпіроўкі студэнта для апускання ў «глыбіні», сутнасць культуры. Тым не менш «межы», якія мы акрэсліваем, усё ж такі дазваляюць сказаць, што асноўная мэта выкладання культуралогіі заключаецца ў тым, каб даць студэнтам разгорнутае, але цалкам адкрытае ўяўленне аб сутнасці, пабудове, тыпах культуры, формах і спосабах іх камунікацыі, тэндэнцыях іх гістарычнай эвалюцыі, а таксама аб спосабах распаўсюджання і сацыяльнага засваення ўтрымліваемых імі ўзораў і нормаў. Выяўленне гэтых «інварыянтаў» культуры павінна дапамагчы зразумець, што быццё чалавека ёсць перш за ўсё «быццё ў культуры». Культуралогія павінна садзейнічаць усведамленню неабходнасці



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

новых парадыгмаў нашага быцця, заснаваных на культуры як універсальнай каштоўнасці.

Спрабуючы выявіць нейкія універсальныя моманты культуры, трэба заўсёды памятаць, што не менш істотным для культуралагічнай адукацыі з'яўляецца навучанне студэнта ўменню трымацца крытычнай дыстанцыі адносна любых сістэм ідэй, трымаць рэфлексную паўзу паміж імпульсам і ўчынкам (сэнс філасофскага погляду на свет згодна М.Мамардашвілі). Самае галоўнае ў сучаснай сітуацыі, можа быць, не выпрацоўка нейкай адназначнай «сацыяльнай тэхналогіі» па выхаду з крызісу, адраджэнню духоўнасці, а крытыка такіх праграм (прапануемых у празмернай колькасці — ад рынацых рэформаў да секты Муна) у рамках своеасаблівага «крытычнага рацыяналізму» К.Попера.

Тады жыццяздольнае ў дадзенай культуры само крышталізуецца ў нейкую мадэль без знешняга дактрынальнага нармавання.

Відавочна, такім чынам, неабходнасць розных падыходаў да пабудовы курса культуралогіі. Але, на наш погляд, у любым выпадку выкладчык павінен імкнуцца да вырашэння наступных задач.

1. Атрыманне студэнтамі абгрунтаваных ведаў аб месцы і ролі культуры ў жыцці чалавека і грамадства, яе значэнні для фарміравання і змянення сістэмы сацыяльных нормаў і ідэалаў у розныя гістарычныя эпохі, перыяды.

2. Вывучэнне разнастайных механізмаў міжнацыянальных, міжрэгіянальных культурных сувязей і абменаў, зместу і гістарычнай змены культурных эпох, развіцця і трансфармацыі гаспадарча-культурных рэгіёнаў і цэлых цывілізацый.

3. Прадметнае знаёмства з гістарычна зменлівымі карцінамі моўных сусветаў, з моўнымі формамі паводзін, якія ўласцівы розным народам свету з іх менталітэтамі, нацыянальнымі рысамі характэру і да т.п.

4. Усведамленне змястоўнага і структурнага адзінства эканамічнай, палітычнай, прававой, маральнай, рэлігійнай, мастацкай, філасофскай культур у грамадствах вызначальных тыпаў.

5. Аб'ёмнае вывучэнне тыпалогіі культуры ў яе самых разнастайных праяўленнях.

6. Вызначэнне месца і ролі прамежкавай этнічна і рэгіянальна структурыраванай культуры Беларусі ў еўрапейскім і сусветным культурна-гістарычным працэсе.

Пры гэтым падкрэслім, што культуралагічная падрыхтоўка студэнтаў у розных тыпах навучальных устаноў павінна быць унутрана суадноснай па прымеце фундаментальнасці і рэпрэзентатыўнасці асноўных раздзелаў культуралагічных ведаў у змесце вучэбных праграм, планаў і непасрэднай вучэбнай дзейнасці. Пазней гэта дасць магчымасць для пераходу спецыяліста (выпускніка) у сумежныя і больш аддаленыя адна ад другой адукацыйныя сферы ў масіве культуралагічных ведаў. У дадзеным выпадку мы маем на ўвазе прафілюючае выкладанне культуралогіі, якое можа здзяйсняцца як пры дапамозе ўключэння профільнага матэрыялу ў асноўны курс, так і на аснове чытання міждысцыплінарных курсаў. Зразумела, што праблематыка і змест курсаў павінны быць варыятыўнымі ў залежнасці ад адукацыйнага поля, да якога адносіцца тая ці іншая спецыяльнасць.

Нарэшце аб чыста дыдактычным вымярэнні спецыфікі культуралагічных ведаў. Зазначым, што тут асабліва выразна праяўляецца прынцып тоеснасці таго, «што» і «як» выкладаецца. Падобна да таго, як, па словах Л.Талстога, нельга навучыць літаратурнай мове (у адрозненне ад граматыкі), нельга навучыць і культуры (у адрозненне ад музейнай інфармацыі па гісторыі культуры).

Ва ўмоўным выглядзе можна прапанаваць наступны алгарытм пабудовы курса культуралогіі. У рамках тэорыі культуры патрэбна даць агульныя ўяўленні аб канцэптуальным апараце вывучэння культуры. Затым, не вычляняючы з агульнага інтэлектуальнага кантэксту асобных ідэй, у рамках своеасаблівага персаналістычнага падыходу (які дазваляе навучэнцу далучыцца да рэальнай даследчыцкай думкі, а не завучваць ананімныя схемы) прааналізаваць канцэпцыі асноўных прадстаўнікоў сучаснай культуралогіі. На семінарскіх жа занятках неабходна паспрабаваць разгледзіць асноўны гісторыка-культурны матэрыял праз атрыманую разнастайную «канцэптуальную оптыку». Нарэшце, пытанні для самастойнай работы і экзаменацыйныя пытанні патрэбна сфармуляваць, у адрозненне ад лекцыйнага выкладання матэрыялу, тэматычным, а не персаналістычным спосабам («мова і культура», «праблема традыцыі ў культуры» і г.д.), каб студэнт мог сам творча перакапфігураваць матэрыял. У працэсе такой «структуралісцкай дзейнасці» (Р.Барт) навучэнец найбольш эфектыўным шляхам засвоіць той інварыянт разумення культуры, які ў процілеглым выпадку яму беспаспяхова будзе спрабаваць маналагічна перадаць выкладчык.

Такім чынам, мы паспрабавалі выкласці некаторыя падыходы да пабудовы курса культуралогіі. Канешне, тэзісна пададзеныя палажэнні патрабуюць падрабязнага разгортвання. Часткова гэта зроблена ў праекце адукацыйнага стандарта па культуралогіі, распрацаванага на кафедры філасофіі і культуралогіі Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы пры БДУ. Далейшым крокам павінна быць распрацоўка варыятыўных праграм, дапаможнікаў, падручнікаў. Зразумела, што гэта справа калектыўная і разлічана не на адзін год. Але пры гэтым, падкрэслім яшчэ раз, трэба шукаць рамкі вызначэння спецыфікі таго «логаса», які, з аднаго боку, будзе ўздымаць «культуразнаўства» да культуралогіі, а з другога, пранізваць усе сучасныя даследаванні чалавека ў прасторы культуры.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ